ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ
БІБЛІЯТЭКА
імя У.І. ЛЕНІНА

# БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ РЫСЫ НЕПАЎТОРНЫЯ




АНАТАВАНЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС

Віцебск, 2026

**БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ РЫСЫ НЕПАЎТОРНЫЯ**

*Анатаваны бібліяграфічны спіс*

Складальнік **Брускова Алена Анатольеўна**

Адказны за выпуск Т. М. Адамян

Камп'ютарная вёрстка А. В. Юпатавай

Мастацкае афармленне А. П. Міклушовай

Тыраж 2 экз.

Лічбавы друк

210015 г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а

E-mail: biblioteka@mail.vlib.by

**ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА**
**імя У. І. ЛЕНІНА**
**Сектар перыядычных выданняў**

**БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ РЫСЫ НЕПАЎТОРНЫЯ**

*Анатаваны бібліяграфічны спіс*

**Віцебск, 2026**

**УДК 371.4**

**ББК 74.200.25(4Беи)**

**Б 43**

Складальнік *А. А. Бруськова*

Рэдакцыйная калегія:

*В. М. Камендантава (адк. рэд.), В. М. Аўсяннікава*

Адказны за выпуск *Т. М. Адамян*

**Беларускай мовы рысы непаўторныя** : анатаваны бібліяграфічны спіс / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», сектар перыядычных выданняў ; [склад. А. А. Бруськова]. – Віцебск, 2026. – 24 с.

Анатаваны бібліяграфічны спіс змяшчае сцэнарыі мерапрыемстваў, распрацоўкі класных гадзін і ўрокаў да Міжнароднага дня роднай мовы, якія накіраваны на далучэнне падрастаючага пакалення да матэрыяльнай і духоўнай спадчыны беларускага народа, выхаванне павагі да роднай мовы.

Дадзены бібліяграфічны спіс адрасаваны педагогам і класным кіраўнікам сярэдніх вучэбных устаноў і ўстаноў дадатковай адукацыі, выхавальнікам дашкольных устаноў, работнікам бібліятэк.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2026

*ўроках роднай мовы.*

119. **Хмялеўская, Н. У.** Залацінкі народнай мудрасці : конкурсная праграма для вучняў 3–4-х класаў / Н. У. Хмялеўская, А. М. Церах // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2023. – № 9. – С. 63–66.

120. **Цімашэнка, Н. П.** Гульнявая праграма «Вясёлы падворак»: этнакультурнае выхаванне школьнікаў на фальклорным матэрыяле малой радзімы / Н. П. Цімашэнка // Народная асвета. – 2024. – № 12. – С. 69–71.

121. **Чаронка, А. П.** «Беларусь мая, родны край ... » : гадзіна паэзіі для вучняў 5–8-х класаў / А. П. Чаронка // Беларуская мова і літаратура. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2020. – № 9. – С. 60–63.

122. **Шаркова, А. М.** «Слова роднае – вечнасці след...» : інтэлектуальная гульня / А. Шаркова // Роднае слова. – 2023. – № 1. – С. 80–81.

*Прапанаваны сцэнарый мерапрыемства, прысвечанага Міжнароднаму дню роднай мовы.*

123. **Шарылава, І. Л**. Краіны роднай патрыёты : гульня-падарожжа / І. Л. Шарылава // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2025. – № 2. – С. 68–70.

*Сцэнарый мерапрыемства для вучняў пачатковай школы па выхаванні павагі да гісторыі і культуры беларускага народа.*

124. **Шпакоўская, Н.** «Знаўцы роднай мовы» : турнір / Н. Шпакоўская // Бібліятэка прапануе. – 2024. – № 7. – С. 14–16.

*Прадстаўлены сцэнарый турніра для вучняў, накіраванага на развіццё творчага мыслення, узбагачэнне слоўнікавага запасу, выхаванне павагі да Беларусі і роднай* мовы.

125. **Эртман, Н. П**. Падарожжа ў краіну Беларуская мова : абагульняльны ўрок па тэме «Я і мая мова» : 1-шы клас / Н. П. Эртман // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2023. – № 4. – С. 48–51.

112. **Троцкая, Т. А.** Інтэлектуальная гульня «Гарадок – сталіца Дня беларускага пісьменства» : для вучняў 9–10-х класаў / Т. А. Троцкая // Беларуская мова і літаратура. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2023. – № 8. – С. 60–62.

113. **Тылькові́ч, В.** «Жыве ў вяках беларуская мова...» : тэматычная інфармацыйная гадзіна для вучняў 8–11-х класаў, прысвечаная Міжнароднаму дню роднай мовы / В. Тылькові́ч // Минская школа сегодня. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2020. – № 2. – С. 47–50.

114. **Фадзеева, А. А.** Віртуальная экскурсія «У музеі роднай мовы» / А. А. Фадзеева // Народная асвета. – 2021. – № 2. – С. 36–38.

*Прапанавана экскурсия для вучняў 6–7-х класаў агульнаадукацыйных устаноў да Міжнароднага дня роднай мовы.*

115. **Філанюк, Л. С.** Гульня «Крыжыкі-нулікі» для вучняў 5-га класа / Л. С. Філанюк // Беларуская мова і літаратура. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2021. – № 1. – С. 61–62.

*Сцэнарый гульні-віктарыны для 5-га класа на веданне беларускай мовы.*

116. **Хазяшава, І. А.** Тыдзень роднай мовы: ведаць слова беларускае : сістэма вучэбна-забаўляльных мерапрыемстваў для дзяцей і бацькоў / І. А. Хазяшава // Народная асвета. – 2025. – № 1. – С. 72–75.

*Прапанаваны варыянт арганізацыі тыдня беларускай мовы ў школе.*

117. **Хмялеўская, Н. У.** Гульня-конкурс «Карагод народных загадак»: далучэнне малодшых школьнікаў да здабыткаў нацыянальнай культуры / Н. У. Хмялеўская, А. М. Церах // Народная асвета. – 2024. – № 4. – С. 78–80.

118. **Хмялеўская, Н. У.** Да роднай мовы крок зрабілі : інтэлектуальны марафон для вучняў 4-га класа / Н. У. Хмялеўская, А. М. Церах // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2025. – № 2. – С. 57–63.

*Выхаванне цікавасці да моўнага багацця беларускага народа на*



## ЗМЕСТ

АД СКЛАДАЛЬНІКА 4

РОДНАЯ МОВА ЯК ВАЖНАЯ ЎМОВА ФАРМІРАВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭІ 6

СЦЭНАРЫІ ВЫХАВАЎЧЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ДА МІЖНАРОДНАГА ДНЯ РОДНАЙ МОВЫ 10

## АД СКЛАДАЛЬНІКА

Мова – гэта не проста сродак зносін, а «генетычны код» культуры. Яна вызначае самаадчуванне чалавека, звязвае яго з гісторыяй продкаў, традыцыямі і звычаямі народа. Першыя думкі, пачуцці, успрыманне свету ўзнікаюць менавіта на роднай мове. Яна закладвае аснову для развіцця інтэлекту. На роднай мове чалавеку прасцей за ўсё выказваць самыя глыбокія эмоцыі і адчуваць сябе «дома», дзе б ён ні знаходзіўся. У кожнай мове ёсць паняцці і нюансы, якія немагчыма дакладна перакласці. Мова – галоўны інструмент перадачы вопыту ад бацькоў да дзяцей, які забяспечвае пераемнасць унутры сям'і і грамадства, служыць захаванню гісторыі і культуры, звычаяў і побыту кожнага народа. Страта мовы – гэта страта цэлага спосабу бачыць свет.

Сёння ў свеце налічваецца каля 60 тыс. моў і палова з іх знаходзіцца пад пагрозай знікнення. З мэтай зберагчы моўнае багацце, моўную разнастайнасць свету на 30-й сесіі Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА ў 1999 годзе дзень 21 лютага быў афіцыйна абвешчаны Міжнародным днём роднай мовы. Гэта рашэнне стала прызнаннем важнасці моўнай разнастайнасці як неад’емнай часткі культурнай спадчыны чалавецтва і магутным інструментам для дасягнення ўстойлівага развіцця. У гэты дзень штогод ва ўсім свеце праводзяцца мерапрыемствы, накіраваныя на павышэнне дасведчанасці аб значэнні родных моў, іх ролі ў адукацыі, культурным развіцці і сацыяльнай інтэграцыі. Асаблівая ўвага надаецца захаванню моў, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення, паколькі кожная зніклая мова з’яўляецца незаменнай стратай для ўсяго чалавецтва, стратай унікальнага спосабу пазнання свету, найбагацейшага пласта ведаў, традыцый і светапоглядаў.

У прапанаваным бібліяграфічным дапаможніку адлюстраваны матэрыялы перыядычных выданняў з фондаў Віцебскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна. Прадстаўлены сцэнарыі і распрацоўкі пазакласных мерапрыемстваў, класных гадзін, накіраваных на абуджэнне



літаратура. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2024. – № 1. – С. 44–48.

104. **Савіцкая, З. У.** Дыяменты роднай мовы : сустрэча ў бібліятэцы да Міжнароднага дня роднай мовы / З. У. Савіцкая // Выхаванне і дадатковая адукацыя. – 2024. – № 1. – С. 25–28.

*Сцэнарый мерапрыемства.*

105. **Служэнка, А. У.** «Прыгоды ў зімовым лесе, ці Дзе падзеўся Зюзя?» : пазакласнае мерапрыемства па беларускай мове ў 1-м класе / А. У. Служэнка // Пачатковая школа. – 2023. – № 11. – С. 48–50.

106. **Смарцэлава, Н. Д.** Квест па кнізе Алеся Марціновіча «Гістарычныя постаці» : матывацыя вучняў 9-га класа да дадатковага чытання беларускай літаратуры / Н. Д. Смарцэлава, В. В. Краўчанка // Народная асвета. – 2023. – № 2. – С. 49–53.

*Матэрыял з кнігі, які выкарыстан ў квэсце, дапаможа фарміраванню цікавасці вучняў да беларускай літаратуры, мовы, гісторыі.*

107. **Старавойтава, Ж.** «Дзіўнае, роднае слова...» : літаратурная гадзіна, прысвечаная Міжнароднаму дню роднай мовы / Ж. Старавойтава // Бібліятэка прапануе. – 2024. – № 5. – С. 38–40, 3-я с. вокл.

108. **Стукачова, Г. Б.** Інтэлектуальная гульня «Кніга – крыніца ведаў» : для вучняў 9–11-х класаў / Г. Б. Стукачова // Беларуская мова і літаратура. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2022. – № 6. – С. 57–60.

109. **Сукора, Н. В**. Геаграфія беларускай мовы : гульня для вучняў 7–9-х класаў / Н. В. Сукора, І. В. Ванюк // Беларуская мова і літаратура. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2022. – № 9. – С. 57–62.

110. **Сушко, В. І.** «Шукальнікі скарбаў» : сцэнарый гульні для вучняў 7–8-х класаў / В. І. Сушко // Беларуская мова і літаратура. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2022. – № 5. – С. 53–58.

111. **Сямашка, Т.** Гучы, наша роднае слова! : забава для дзяцей старшай групы (5–6 гадоў) / Т. Сямашка // Пралеска. – 2025. – № 1. – С. 65–68.

*Прадстаўлены сцэнарый забавы для дашкольнікаў, накіраванай на пашырэнне ўяўленняў пра беларускі фальклор.*

*роднай мовы для вучняў 7–11-х класаў агульнаадукацыйных устаноў.*

96. **Міхно, Т. В.** «Найвялікшае сонца – мая беларуская мова» : гульня-квэст для вучняў 6–7-х класаў / Т. В. Міхно // Беларуская мова і літаратура. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2023. – № 2. –С. 59–62.

97. **Навумава, Т. П**. Паўтараем, гуляем, на роднай мове размаўляем : літаратурны брэйн-рынг для вучняў 3-га класа / Т. П. Навумава // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2024. – № 1. – С. 63–65.

98. **Несцяровіч, А. Ф.** Віктарына «Гучы, роднае слова!» : фарміраванне ў вучняў 6-га класа станоўчай матывацыі да вывучэння беларускай мовы і літаратуры / А. Ф. Несцяровіч // Народная асвета. – 2023. – № 2. – С. 38–39.

99. **Нічыпарук, Г. М.** Вячоркі «Тут сучаснасць з даўнінаю сышліся» : да Міжнароднага дня роднай мовы / Г. М. Нічыпарук // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2023. – № 1. – С. 67–70.

100. **Носава, Н.** Гучы, родная мова! : вандроўка па старонках беларускіх кніг / Н. Носава // Бібліятэка прапануе. – 2024. – № 8. – С. 10–12.

*Прадстаўлены сцэнарый мерапрыемства, накіраванага на грамадзянска-патрыятычнае выхаванне вучняў.*

101. **Падчапіла, Т.** Дзень роднай мовы / Т. Падчапіла // Бібліятэка прапануе. – 2020. – № 5. – С. 37–38.

*Прадстаўлены вопыт правядзення Дня роднай мовы бібліятэкай-філіялам № 4 імя М. Лермантава г. Магілёва.*

102. **Прохарава, А.** «Святыя словы: маці, мова і Радзіма» : творчы праект / А. Прохарава // Бібліятэка прапануе. – 2023. – № 8. – С. 15–18.

*Прадстаўлены сцэнарый мерапрыемства, накіраванага на сацыяльнае і духоўнае станаўленне вучняў, грамадзянска-патрыятычнае выхаванне.*

103. **Ребковец, Т. С.** «Магутнае слова, ты, роднае слова!» : викторина для 7–11-х классов / Т. С. Ребковец // Русский язык и



цікавасці да беларускай мовы, выхаванне любові да беларускага слова, павагі да культуры і гісторыі свайго народа.

Крыніца пошуку інфармацыі пры складанні дапаможніка – электронны каталог бібліятэкі. Храналагічны перыяд ахопу бібліяграфічных запісаў – 2020–2025 гг. Бібліяграфічныя запісы, уключаныя ў дапаможнік, складзены ў адпаведнасці з СТБ 7.1-2024 «Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне. Агульныя патрабаванні і правілы складання» і прыводзяцца ў алфавіце прозвішчаў аўтараў і (або) загалоўкаў адлюстраваных дакументаў.

Анатаваны бібліяграфічны спіс адрасаваны педагогам навучальных устаноў і ўстаноў дадатковай адукацыі, выхавальнікам дашкольных устаноў, работнікам бібліятэк.

## РОДНАЯ МОВА ЯК ВАЖНАЯ ЎМОВА ФАРМІРАВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭІ

1. **Алейнік,** А. Горад у летапісе. Полацк / А. Алейнік // Бібліятэка прапануе. – 2023. – № 2. – С. 29–31.

*Прадстаўлены сцэнарый гутаркі, накіраванай на знаёмства вучняў 6–7-х класаў з гісторыяй старажытнага Полацка.*

2. **Алейнік, А.** Імя ў летапісе. Еўфрасіння Полацкая / А. Алейнік // Бібліятэка прапануе. – 2023. – № 11. – С. 38–40.

*Прапанаваны сцэнарый гутаркі, накіраванай на знаёмства вучняў 5–6-х класаў з жыццём і дзейнасцю святой Еўфрасінні Полацкай.*

3. **Алейнік, А.** Імя ў летапісе. Рагнеда : форма правядзення: гутарка / А. Алейнік // Бібліятэка прапануе. – 2023. – № 1. – С. 5–7.

*Прадстаўлены сцэнарый гутаркі для вучняў 6–7-х класаў, прысвечанай жыццю і дзейнасці князёўны Рагнеды.*

4. **Алейнік, А.** Пісьменства ў Беларусі: крок у гісторыю / А. Алейнік // Бібліятэка прапануе. – 2022. – № 8. – С. 2–5.

*Прадстаўлены сцэнарый гістарычнага квіза для вучняў 8–9-х класаў, накіраванага на папулярызацыю гісторыка-культурнай спадчыны радзімы.*

5. **Багамольнікава, Н. А**. Даследчая дзейнасць школьнікаў на прыкладзе вывучэння ўласных імёнаў / Н. А. Багамольнікава // Роднае слова. – 2025. – № 9. – С. 81–84.

6. **Басак, В. А.** Як вывучаць беларускую мову з цікавасцю?: выкарыстанне эфектыўных прыёмаў для актывізацыі пазнавальнай дзейнасці малодшых школьнікаў / В. А. Басак // Народная асвета. – 2024. – № 2. – С. 63–65.

*Апісаны прыёмы арганізацыі вучэбнай дзейнасці на ўроку ў мэтах павышэння матывацыі да вывучэння прадмета, для фарміравання моўных уменняў і навыкаў.*

7. **Бураўкін, Г. М.** «Я ведаю: нядобрых моў няма…» : [верш] /



прысвечаная Дню роднай мовы / А. У. Лупсякова // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2025. – № 1. – С. 52–54.

90. **Мазуркевіч, А.** «Ведай і любі родную мову!» : гульня-конкурс для 6–7-х класаў да Міжнароднага дня роднай мовы / А. Мазуркевіч, Н. Канопліч // Бібліятэка прапануе. – 2021. – № 2. – С. 2–5.

*Прадстаўлены сцэнарый гульні-конкурса для вучняў, накіраванай на стварэнне ўмоў для абуджэння цікавасці да вывучэння беларускай мовы і літаратуры, да гісторыі роднага краю, традыцый беларускага народа.*

91. **Макарава, А. А.** З крыніц народнай душы і памяці : фальклорна-музычнае мерапрыемства для вучняў 5-га класа / А. А. Макарава // Беларуская мова і літаратура. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2025. – № 10. – С. 56–60.

*Прадстаўлены сцэнарый мерапрыемства для пяцікласнікаў, накіраванага на пашырэнне і замацаванне ведаў пра вусную народную творчасць.*

92. **Мартынюк, В. У.** Гульня «Размаўляй па-беларуску» / В. У. Мартынюк // Пачатковая школа. – 2024. – № 6. – С. 54–55.

93. **Марцэвіч, Т. А.** Гульня-падарожжа «Наперад у казку, назад у мінулае!» : павышэнне матывацыі вучняў 5–6-х класаў да вывучэння культурнай спадчыны беларусаў / Т. А. Марцэвіч // Народная асвета. – 2023. – № 2. – С. 43–45.

94. **Марцэвіч, Т. А.** Дзіцяча-бацькоўская гульня «З мінулага ў сучаснасць»: выкарыстанне інфармацыйнага патэнцыялу школьнага музея / Т. А. Марцэвіч // Народная асвета. – 2025. – № 1. – С. 83–85.

*Прапанавана гульня для вучняў 5–7-х класаў і іх бацькоў, якая мае на мэце пашырэнне ведаў удзельнікаў пра гісторыю, побытавую культуру, духоўную спадчыну беларускага народа.*

95. **Марцэвіч, Т. А.** Жывая газета «Шчасце на вуснах – родная мова» / Т. А. Марцэвіч // Народная асвета. – 2021. – № 2. – С. 32–35.

*Прадстаўлены сцэнарый мерапрыемства да Міжнароднага дня*

*Пашырэнне ведаў навучэнцаў пра выдатную беларускую асветніцу, яе служэнне справе народнай асветы, развіцця нацыянальнай культуры, роднай мовы і літаратуры.*

82. **Касцючкова, І. С.** Беларуская мова – мелодыя сэрца! : свята мовы ў ГПД, прысвечанае Міжнароднаму дню роднай мовы (21 лютага) / І. С. Касцючкова // Пачатковая школа. – 2024. – № 1. – С. 25–26.

*Прадстаўлены сцэнарый мерапрыемства для груп падоўжанага дня.*

83. **Коваль, Т.** Родную мову з маленства пазнаём : літаратурна-музычная забава для дзяцей старшай групы (5–7 гадоў) / Т. Коваль // Пралеска. – 2025. – № 6. – С. 19–21.

84. **Кузьміч, А. Ф.** Літаратурна-музычная гасцёўня «Спявай, гучы, натхняй, беларуская мова!» : сцэнарый адкрыцця тыдня беларускай мовы і літаратуры / А. Ф. Кузьміч // Народная асвета. – 2023. – № 2. – С. 32–34.

85. **Куляшова, Н.** Турнір знаўцаў «З роднай моваю на “ты”» : пазакласнае мерапрыемства па беларускай мове і літаратуры для 5–9-х класаў / Н. Куляшова // Бібліятэка прапануе. – 2020. – № 7. – С. 32–34.

86. **Ладзята, Ж.** Слова роднае – вечнасці след : сцэнарый конкурсу эрудытаў беларускай мовы / Ж. Ладзята // Бібліятэка прапануе. – 2020. – № 5. – С. 17–21.

*Прадстаўлены сцэнарый конкурсу эрудытаў роднай мовы, накіраванага на далучэнне моладзі да вытокаў і першаасновы беларускай культуры.*

87. **Лехава, Н.** Слова ў гульні : скорагаворкі, лічылкі / Н. Лехава // Бібліятэка прапануе. – 2024. – № 7. – С. 28–30.

*Прадстаўлены сцэнарый занятка, накіраванага на далучэнне вучняў да фальклорнай спадчыны.*

88. **Лісоўская, Н. М.** Знаўцы беларускай мовы : пазакласнае мерапрыемства для вучняў 3–4-х класаў да Дня роднай мовы / Н. М. Лісоўская // Пачатковая школа. – 2021. – № 1. – С. 62–63.

89. **Лупсякова, А. У.** Квест-гульня «Юныя мовазнаўцы»,



Г. М. Бураўкін // Выхаванне і дадатковая адукацыя. – 2020. – № 1. – 2-я с. вокл.

*Верш да Міжнароднага дня роднай мовы (21 лютага).*

8. **Важнік, С. А.** «Наша доля» – «Наша ніва»: дзве газеты – адзін праект / С. А. Важнік // Роднае слова. – 2025. – № 8. – С. 49–51.

*У артыкуле прааналізаваны абставіны фарміравання новай беларускай літаратурнай мовы, на якой выходзілі першыя беларускія газеты «Наша доля» і «Наша ніва» ў пачатку XX ст. Адзначана, што друк афіцыйных беларускамоўных газет адбываўся ва ўмовах моўнага сінкрэтызму пад уздзеяннем трох моўных стыхій – польскай, рускай і ўласнабеларускай.*

9. **Ганчарук, І.** Трыгер яднання: родная мова як маці – хіба можна падзяліць ці забыць яе? / І. Ганчарук // Беларуская думка. – 2022. – № 2. – С. 24–26.

*У артыкуле аўтар разважае над няпростым пытаннем аб ролі і значэнні беларускай мовы на сённяшнім этапе.*

10. **Доля, П.** Неверагодная гісторыя клічніка! / П. Доля // Беларуская думка. – 2022. – № 2. – С. 27–28.

*Займальны аповед пра паходжанне і ўжыванне такога знаку прыпынку моўнай пунктуацыі як клічнік.*

11. **Запрудскі, С. М.** Канстанцін Калайдовіч як даследчык беларускай мовы / С. М. Запрудскі // Роднае слова. – 2021. – № 9. – С. 56–59.

*Разгледжана навуковая дзейнасць расійскага лінгвіста XIX ст. К. Ф. Калайдовіча, прысвечаная вывучэнню беларускай мовы.*

12. **Запрудскі, С. М.** «Некананічная» беларуская мова : да стагоддзя з часу выхаду першага нумара часопіса «Полымя» / С. М. Запрудскі // Роднае слова. – 2023. – № 1. – С. 44–47.

*Вызначана спецыфіка моўнага узусу часопіса «Полымя» ў 1920-я гг., прыведзены прыклады слоў, якія сёння выйшлі з актыўнага ўжытку.*

13. **Іваноў, Я. Я.** «Мы ловім крылатыя словы...» : крылатыя выразы і афарызмы ў беларускай мове / Я. Іваноў // Роднае слова. – 2025. – № 2. – С. 80–84.

*Разгледжаны ўніверсальныя выказванні, якія маюць іншамоўнае паходжанне.*

14. **Іваноў, Я. Я.** «На свеце многа слоў крылатых, па зместу мудрых і багатых!» : крылатыя выразы і афарызмы з сучасных еўрапейскіх моў / Я. Я. Іваноў // Роднае слова. – 2025. – № 8. – С. 57–62.

*Разгледжаны крылатыя словы і афарызмы, запазычаныя ў сучасную беларускую літаратурную мову з еўрапейскіх моў.*

15. **Капылоў, І. Л.** Клопат аб развіцці нацыянальнай мовы – прыярытэт акадэмічнай лінгвістыкі : з нагоды 95-годдзя Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа / І. Л. Капылоў // Роднае слова. – 2024. – № 11. – С. 3–5.

*Прадстаўлены вынікі навукова-даследчай дзейнасці Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа ў лексікаграфічным накірунку.*

16. **Капылоў, І. Л**. Роля акадэмічнага мовазнаўства ў сацыяльна-эканамічным і духоўна-культурным жыцці Рэспублікі Беларусь / І. Л. Капылоў // Наука и инновации. – 2025. – № 5. – С. 37–42.

*Прааналізавана навуковае, практычнае і сацыяльнае значэнне падрыхтаваных акадэмічнымі мовазнаўцамі работ. Адзначана іх роля ў павышэнні прэстыжу беларускай мовы ў грамадстве і замацаванні яе статуса як высокаразвітай літаратурнай мовы са стабільнымі нормамі і багатым слоўным запасам.*

17. **Караткевіч, В. І.** Гістарычная асоба ў развіцці роднай мовы: метадычныя аспекты вывучэння / В. І. Караткевіч, І. І. Караткевіч // Народная асвета. – 2025. – № 2. – С. 28–31.

*Найважнейшай задачай, якую павінны вырашаць вучэбныя прадметы гуманітарнай скіраванасці, з’яўляецца вызначэнне ролі асобнага чалавека як самакаштоўнай адзінкі ў гістарычным і культурным развіцці, у прыватнасці, у развіцці мовы.*

18. **Карлюкевіч, А.** Алесь Карлюкевіч: « ... Калі шырока глядзіш на ўвесь свет» / А. Карлюкевіч ; гутарыў І. Ганчарук // Беларуская думка. – 2025. – № 2. – С. 34–39.



74. **Зубко, А. С.** Інтэлектуальна-пазнавальная гульня «Цудоўная сямёрка» для вучняў 7–1І-х класаў / А. С. Зубко // Беларуская мова і літаратура. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2023. – № 6. – С. 58–61.

75. **Зяткіна, Н. М.** Дзіцяча-бацькоўскі рынг «Бабуліна спадчына»: выкарыстанне аб'яднальнай сілы народных традыцый / Н. М. Зяткіна // Народная асвета. – 2025. – № 4. – С. 88–90.

*Прапануецца дзіцяча-бацькоўскій рынг для навучэнцаў і іх бацькоў, мэтай якога з'яўляецца садзеянне сем'ям у аптымізацыі ўзаемаадносін праз фарміраванне сямейных традыцый.*

76. **Казлоўская, І. І**. Мовазнаўчы рынг «Ведай роднае слова! » : гульня для вучняў 8–9-х класаў / І. І. Казлоўская // Беларуская мова і літаратура. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2023. – № 11. – С. 59–62.

77. **Казлоўская, І. І.** Мова – наша спадчына : гульня-падарожжа для вучняў 7–9-х класаў / І. І. Казлоўская // Беларуская мова і літаратура. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2024. – № 9. – С. 61–64.

78. **Камякевіч, В.** Мова – скарб народа / В. Камякевіч // Бібліятэка прапануе. – 2023. – № 8. – С. 35–36.

*Прадстаўлены вопыт бібліятэк Зэльвеншчыны па правядзенні мерапрыемстваў да Міжнароднага дня роднай мовы.*

79. **Кананові́ч, Т. У**. Літаратуразнаўчая гульня «Каб не страціць святое штосьці ..» : абуджэнне ў вучняў 8-га класа цікавасці да вывучэння беларускай мовы / Т. У. Кананові́ч // Народная асвета. – 2023. – № 2. – С. 46–48.

80. **Кандраценка, П.** «Каб любіць Беларусь нашу мілую..» : сцэнарная распрацоўка інтэрактыўнай гульні / П. Кандраценка // Бібліятэка прапануе. – 2021. – № 9. – С. 13–15.

*Прадстаўлены сцэнарый інтэрактыўнай гульні, накіраванай на выхаванне ў дзяцей пачуцця патрыятызму і гонару за сваю краіну.*

81. **Кастрыца, А. А.** Гісторыка-лінгвістычная гульня «Беларуская асветніца Ефрасіння Полацкая» / А. А. Кастрыца, В. А. Кіслова // Народная асвета. – 2025. – № 2. – С. 32–33.

*мовы, да беларускага народа, яго культурнай і гістарычнай спадчыны.*

66. **Жулінская, Н.** Звонкія, спеўныя словы роднай мовы : гасцёўня для бацькоў / Н. Жулінская // Пралеска. – 2025. – № 3. – С. 76.

*Прадстаўлены сцэнарый мерапрыемства для бацькоў дзяцей дашкольнага ўзросту, накіраванага на абуджэнне цікавасці да роднай мовы.*

67. **Жылук, Т.** Восень і яе дары : сцэнарый сустрэчы ў педагагічным клубе «МОВА ціКАВА» / Т. Жылук // Пралеска. – 2024. – № 11. – С. 42–45.

*Прадстаўлены сцэнарый сустрэчы, накіраванай на стварэнне ўмоў для абуджэння ў педагагічных работнікаў цікавасці да роднай мовы. Прапанавана падборка моўных гульняў для выкарыстання бацькамі.*

68. **Жышко, С. А.** Школьнае свята «Мова родная, беларуская» / С. А. Жышко // Народная асвета. – 2021. – № 2. – С. 49–50.

69. **Завала, С.** Пасядзелкі каля печы : літаратурна-фальклорная гасцёўня для дзяцей старшай групы (6–7 гадоў) / С. Завала // Пралеска. – 2022. – № 2. – С. 75–78.

70. **Захарчук, І.** Падарожжа ў свет кнігі : інтэлектуальна-пазнавальная літаратурная гульня для вучняў 8–9-х класаў / І. Захарчук // Бібліятэка прапануе. – 2024. – № 10. – С. 2–6.

71. **Захарэвіч, І. І.** Прыказкі і загадкі з родных паселішчаў і палеткаў : пазакласнае мерапрыемства для вучняў 5-га класа / І. І. Захарэвіч // Беларуская мова і літаратура. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2022. – № 12. – С. 48–50.

72. **Зелянко, С. В.** Гісторыя літар і гісторыі пра літары : дапаможны матэрыял для настаўніка / С. В. Зелянко // Беларуская мова і літаратура. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2024. – № 10. – С. 20–24.

*Прыведзены займальныя звесткі па гісторыі беларускага правапісу, а таксама гульнявыя заданні для адпрацоўкі арфаграфічных уменняў вучняў на ўроках беларускай мовы.*

73. **Зубко, А. С.** «Роднае слова, родную мову ведаем і шануем» : гульня (8–11-я класы) / А. Зубко // Роднае слова. – 2020. – № 2. – С. 70–73.



*Гутарка з вядомым журналістам і пісьменнікам А. М. Карлюкевічам пра ролю пісьменніка ў папулярызацыі роднай мовы і літаратуры.*

19. **Кур'яновіч, А. В**. Як беларуская мова стала адзінай дзяржаўнай / А. В. Кур'яновіч // Arche. ─ 2020. ─ № 1. ─ С. 10─13.

20. **Кручкоў, Я.** Невычэрпная крыніца – родная мова / Я. Кручкоў // Belarus. – 2025. – № 2. – С. 108–110.

*Разгледжаны ўнёсак супрацоўнікаў Інстытута мовазнаўства НАН Беларусі ў захаванне, вывучэнне і папулярызацыю моўнай спадчыны як сведчання нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці беларусаў.*

21. **Мельнікава, А. М.** Пытанні нацыянальнай ідэнтычнасці ў работах Антона Луцкевіча / А. М. Мельнікава // Роднае слова. – 2023. – № 3. – С. 28–30.

*Выяўлены падыходы даследчыка літаратуры А. Луцкевіча да асэнсавання праблем нацыянальнай ідэнтычнасці, пытання станаўлення беларуса як суб'екта гісторыі.*

22. **Паноў, С. В.** Школьная гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь: фарміраванне нацыянальна-культурнага і аксіялагічнага зместу навучання сродкамі вучэбнага прадмета «Гісторыя Беларусі» / С. В. Паноў // Веснік адукацыі. – 2023. – № 6. – С. 5–9.

23. **Садзілава, Н. М.** Краязнаўчы праект «Адраджэнне нацыянальных традыцый»: фарміраванне ў школьнікаў нацыянальнай самасвядомасці і самаідэнтыфікацыі сродкамі беларускага фальклору / Н. М. Садзілава // Народная асвета. – 2024. – № 10. – С. 44–46.

24. **Саверчанка, І. В**. Вытокі беларускага этнасу / І. В. Саверчанка // Наука и инновации. – 2025. – № 11. – С. 50–56.

*Аналізуецца паходжанне беларусаў, фарміраванне іх цывільнай, моўнай, культурнай прыналежнасці пачынаючы ад гістарычных часоў і эпохі Антычнасці. Даводзіцца, што беларусы ўяўляюць сабой старажытную этнічную групу насельніцтва Еўразіі, якая брала актыўны*

*ўдзел у многіх сусветна вядомых, лёсаносных для кантынента гістарычных падзеях.*

25. **Слука, А. Г.** Нацыянальная ідэя – шлях народа / А. Г. Слука // Гісторыя і грамадазнаўства. – 2023. – № 4. – С. 30–32.

*У артыкуле сфармулявана аўтарскае бачанне канцэпцыі фарміравання беларускай нацыянальнай ідэі. На аснове аналізу гістарычнага працэсу развіцця беларускай нацыі паказана адвечнае імкненне нашага народа да свабоды, незалежнасці і справядлівасці.*

26. **Тылькoвіч, В. Ю.** З гісторыі развіцця беларускай мовы : інфармацыйная гадзіна, прысвечаная Міжнароднаму дню роднай мовы / В. Ю. Тылькoвіч // Выхаванне і дадатковая адукацыя. – 2021. – № 1. – С. 27–29.

27. **Фадзеева, А. А.** Вечарына-партрэт «Францыск Скарына – першадрукар і асветнік» / А. А. Фадзеева // Народная асвета. – 2025. – № 2. – С. 34–35.

*Фарміраванне ў навучэнцаў усведамлення значнасці асветніцкай дзейнасці Ф. Скарыны і яго ролі ў развіцці роднай мовы.*

## СЦЭНАРЫІ ВЫХАВАЎЧЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ДА МІЖНАРОДНАГА ДНЯ РОДНАЙ МОВЫ

28. **Алейнік, А.** Таямніцы родных слоў : да Міжнароднага дня роднай мовы / А. Алейнік // Бібліятэка прапануе. – 2021. – № 2. – С. 6–8.

*Прадстаўлены сцэнарый урока, накіраванага на замацаванне ведаў па беларускай мове вучняў 6–7-х класаў.*

29. **Алейнік, А. М.** Бібліятэчны ўрок «Моўныя скарбы ў традыцыях народнага мастацтва» : азнаямленне вучняў 6–7-х класаў з нацыянальнымі традыцыямі / А. М. Алейнік // Народная асвета. – 2023. – № 2. – С. 40–42.

*Мерапрыемства накіравана на далучэнне школьнікаў да*



нашай беларускай!..» : 9–10-я класы / Т. К. Грэбень // Беларуская мова і літаратура. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2022. – № 1. – С. 62–64.

59. **Гусак, І.** Заданні Бульбашыка : заняткі па адукацыйных галінах «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін» і «Дзіця і прырода» для дзяцей старшай групы (5–6 гадоў) / І. Гусак, Г. Філіповіч // Пралеска. – 2025. – № 12. – С.61–63.

*Прадстаўлены сцэнарый заняткаў, накіраваных на фарміраванне ўстойлівай цікавасці да беларускай мовы.*

60. **Дзерашава, А. А**. Брэйн-рынг «У свеце роднай мовы» : інтэлектуальная гульня для вучняў 9–11-х класаў / А. А. Дзерашава // Беларуская мова і літаратура. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2023. – № 1. – С. 58–60.

61. **Дзямбіцкая, Н.** «У краіне народнай творчасці» : гульня на лепшага знаўца беларускага фальклору / Н. Дзямбіцкая // Бібліятэка прапануе. – 2021. – № 2. – С. 13–16.

*Прадстаўлены сцэнарый гульні для школьнікаў, накіраванай на фарміраванне павагі і цікавасці да беларускай народнай спадчыны.*

62. **Дзямідзік, А. А**. Мова – крыніца жыцця : мерапрыемствы да Міжнароднага дня роднай мовы / А. А. Дзямідзік // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2024. – № 1. – С. 21–23.

63. **Ермачэнка, С. В.** Размаўляй па-беларуску / С. В. Ермачэнка, В. Р. Лабоха // Пачатковая школа. – 2020. – № 2. – С. 50–52.

64. **Жабко, Я. Г.** Родная мова / Я. Г. Жабко // Буся. – 2025. – № 1. – С. 4.

*Верш да Дня роднай мовы.*

65. **Жукоўская, С.** «Сябры роднай мовы» : інтэлектуальна-пазнавальная гульня / С. Жукоўская // Бібліятэка прапануе. – 2021. – № 9. – С. 10–12.

*Прадстаўлены сцэнарый інтэлектуальна-пазнавальнай гульні для вучняў 4-х класаў, накіраванай на выхаванне павагі і цікавасці да роднай*

50. **Віктарава, А.** «Беларуская скарбонка» : сцэнарый мерапрыемства ў 3 класе / А. Віктарава // Бібліятэка прапануе. – 2021. – № 2. – С. 16–20.

*Прадстаўлены сцэнарый мерапрыемства для вучняў 3-га класа, накіраванага на замацаванне ведаў па беларускай мове.*

51. **Высоцкая, М. А.** «Магутнае слова, ты, роднае слова!» : літаратурна-музычная праграма да Міжнароднага дня роднай мовы (21 лютага) / М. А. Высоцкая // Пачатковая школа. – 2024. – № 1. – С. 22–24.

52. **Гайко, Т.** QR-квэст «Па краіне лексікі і фразеалогіі» / Т. Гайко, В. Пенда // Роднае слова. – 2025. – № 8. – С. 19–20.

*Прапанавана распрацоўка мовазнаўчай гульні з прымяненнем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.*

53. **Гаўрылік, А. С.** Інтэрактыўная гульня «Размаўляем па-беларуску» / А. С. Гаўрылік // Народная асвета. – 2022. – № 9. – С. 77–78.

54. **Горагляд, Л.** «Ветлівыя словы беларускай мовы» : вусны часопіс для пачатковых класаў / Л. Горагляд // Бібліятэка прапануе. – 2020. – № 7. – С. 35–37.

55. **Грынчук, Л.** «Гаворым па-беларуску» : гутарка-гульня для 3–4-х класаў / Л. Грынчук // Бібліятэка прапануе. – 2020. – № 8. – С. 35–38.

*Прадстаўлены сцэнарый гутаркі-гульні для пачатковых класаў, накіраванай на падтрыманне цікавасці да беларускай мовы і літаратуры, развіццё моўнай культуры.*

56. **Грыцук, В.** «Беларускаму краю бясконца я слова «люблю» паўтараю ... » : гульня-падарожжа да XXXII Дня беларускага пісьменства (8–9-я класы) / В. Грыцук // Роднае слова. – 2025. – № 8. – С. 21–22.

*Прапанаваны сцэнарый мерапрыемства, прысвечанага гісторыі і традыцыі святкавання Дня беларускага пісьменства.*

57. **Грышкевіч, Г. М.** Турнір знаўцаў «Беларуская мова – родная мова» / Г. М. Грышкевіч // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2023. – № 1. – С. 70–72.

58. **Грэбень, Т. К.** Інтэрактыўная гульня «Не пакідайце ж мовы



*матэрыяльнай і духоўнай спадчыны беларускага народа праз азнаямленне з нацыянальнымі традыцыямі і звычаямі.*

30. **Андрасюк, В. І.** Мову, спадчыну сваю шануй і беражы : інтэлектуальная гульня-квіз для вучняў 9–11-х класаў / В. І. Андрасюк // Беларуская мова і літаратура. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2024. – № 5. – С. 57–63.

31. **Астроўская, Т. М.** Літаратурна-музычная гасцёўня «Каб ведаць роднае» / Т. М. Астроўская // Народная асвета. – 2021. – № 2. – С. 47–48.

32. **Бабіч, Т. С.** «Як ты дорага мне, мая родная мова!» : конкурсна-пазнавальнае мерапрыемства да Дня роднай мовы для вучняў 5–8-х класаў / Т. С. Бабіч // Беларуская мова і літаратура. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2021. – № 1. – С. 57–60.

33. **Багдановіч, М. І.** Знаўцы і эрудыты : пазнавальна-займальная гульня для вучняў 5–8-х класаў / М. І. Багдановіч // Беларуская мова і літаратура. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2024. – № 5. – С. 48–50.

*Прапанаваны сцэнарый пазакласнага мерапрыемства па замацаванні ведаў вучняў па беларускай мове і літаратуры.*

34. **Байко, Т. М.** Літаратурная вечарына «Я – пякучка-крапіва» для вучняў 6–9-х класаў / Т. М. Байко // Беларуская мова і літаратура. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2021. – № 3. – С. 52–54.

35. **Бандарэнка, М. В.** Мова мая беларуская : інтэлектуальная «Свая гульня» для вучняў 5–8-х класаў / М. В. Бандарэнка // Беларуская мова і літаратура. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2023. – № 11. – С. 54–58.

36. **Бандарэнка, М.** «Цеплыня беларускага слова ў звычайных рэчах» : інтэлектуальная «Свая гульня» / М. Бандарэнка // Бібліятэка прапануе. – 2023. – № 8. – С. 6–10.

*Прадстаўлены сцэнарый інтэлектуальнай гульні для вучняў 5–8-х класаў, накіраванай на пашырэнне ведаў пра родны край, беларускую мову і літаратуру.*

37. **Бандарэнка, М.** «Чароўнае кола» : літаратурна-інтэлектуальная

гульня / М. Бандарэнка // Бібліятэка прапануе. – 2021. – № 9. – С. 5–10.

*Прадстаўлены сцэнарый літаратурна-інтэлектуальнай гульні для вучняў 4–6-х класаў, накіраванай на выхаванне пачуцця гонару за родную мову і паважлівых адносін да роднай мовы і літаратуры.*

38. **Бондар, А. У.** Падарожжа па краіне беларускай мовы : пазакласнае мерапрыемства ў 3–4-х класах / А. У. Бондар // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2022. – № 1. – С. 69–71.

39. **Бунас, В. М.** Квітней, мая родная мова! : культурная праграма, 4-ты клас / В. М. Бунас // Пачатковая школа. – 2023. – № 2. – С. 30–32.

40. **Бурвін, Л. М.** «Само слова гаворыць...» : пазакласнае мерапрыемства (9–11-я класы) / Л. М. Бурвін // Роднае слова. – 2020. – № 2. – С. 67–70.

*Прадстаўлены сцэнарый мерапрыемства, прысвечанага Міжнароднаму дню роднай мовы.*

41. **Буткевіч, Г.** Займальная мова : пазакласнае мерапрыемства па беларускай мове / Г. Буткевіч // Минская школа сегодня. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2024. – № 9. – С. 48–51.

*Прапанаваны сцэнарый пазакласнага мерапрыемства па беларускай мове для навучэнцаў каледжа.*

42. **Быкава, І.** Гучы, наша мова! / І. Быкава // Пралеска. – 2022. – № 4. – С. 50–53.

*Разгледжаны вопыт ясляў-сада № 13 г. Магілёва па далучэнні дзяцей да роднай мовы. Прадстаўлены сцэнарый пасяджэння дзіцяча-бацькоўскага клуба «Крыніца», накіраванага на фарміраванне ўстойлівай цікавасці і станоўчых адносін да беларускай мовы выхаванцаў і іх бацькоў.*

43. **Бязручка, Л.** Мова: гісторыя, асобы : інтэлектуальная гульня (10–11-я класы) / Л. Бязручка // Роднае слова. – 2022. – № 2. – С. 82–83.

*Прыведзена распрацоўка інтэлектуальнага мерапрыемства для старшакласнікаў, прымеркаванага да Міжнароднага дня роднай мовы.*



44. **Бяльцова, В. М.** «Кветкі Радзімы» : майстар-клас для 2-га, 3-га класаў да Дня роднай мовы (21 лютага) / В. М. Бяльцова // Пачатковая школа. – 2025. – № 1. – С. 52–54.

*Прапанаваны пазакласны занятак па вырабе сваімі рукамі з паперы васілька – аднаго з сімвалаў Беларусі.*

45. **Вайтовіч, Т. У.** Лінгвістычны спрынт «Таямніцы роднай мовы» : выхаванне ў вучняў 10–11-х класаў павагі да роднага слова / Т. У. Вайтовіч // Народная асвета. – 2023. – № 2. – С. 35–37.

46. **Вайцахоўская, А.** «Знаўцы літаратуры» : літаратурнае спаборніцтва / А. Вайцахоўская // Бібліятэка прапануе. – 2024. – № 12. – С. 17–19.

*Прадстаўлены сцэнарый літаратурнай гульні па беларускай літаратуры для вучняў.*

47. **Васільева, М.** **У** нашым двары – сапраўдныя гаспадары : забава для дзяцей старшай групы (5–6 гадоў) / М. Васільева // Пралеска. – 2020. – № 6. – С. 73–75.

*Прадстаўлены сцэнарый забавы для дашкольнікаў, накіраваны на далучэнне дзяцей да беларускай культуры і мовы, развіцця цікавасці да музычнага выканання і творчасці.*

48. **Васюк, Н.** З любоўю да роднага слова : пазаўрочнае мерапрыемства па беларускай мове / Н. Васюк // Минская школа сегодня. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2025. – № 1. – С. 48–51.

*Прыведзена распрацоўка пазакласнага мерапрыемства для навучэнцаў каледжа ў выглядзе квэст-гульні, мэта якога – выхаванне павагі да роднай мовы.*

49. **Васюк, Н.** Размаўляем па-беларуску : метадычная распрацоўка адкрытага пазаўрочнага мерапрыемства / Н. Васюк // Минская школа сегодня. Серыя «У дапамогу педагогу». – 2022. – № 7. – С. 44–47.

*Прыведзена распрацоўка пазакласнага мерапрыемства для навучэнцаў каледжа, мэта якога – выхаванне павагі да роднай мовы.*